*ветам Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту* выдавалася *«Советская правда»*. *Мікалай Сяменчык.*

**ФРОНТ ВАЕННЫ**, вышэйшае аператыўнае аб'яднанне ўзбр. сіл для выканання аператыўна-стратэгічных задач у пэўным аперацыйным напрамку. На тэр. Беларусі дзейнічалі ў час 1-й сусв. вайны 1914—18 *Паўночна-Заходні фронт 1914—15, Заходні фронт 1915—18, Паўночны фронт 1915—18*, аб'яднанне войск Чырв. Арміі *Заходні фронт 1919—24*, у час польска-герм. вайны 1939 *Беларускі фронт 1939*, у Вял. Айч. вайну 1941—44 *Цэнтральны фронт, Заходні фронт 1941—44, Беларускі фронт 1943—44, Беларускі фронт 1-ы, Беларускі фронт 2-і, Беларускі фронт 3-і, Прыбалтыйскі фронт першы.*

**ФРУ́НЗЕ** Міхаіл Васілевіч [21.1(2.2).1885, г. Пішпек, цяпер Бішкек, сталіца Кыргызстана — 31.10.1925], рэвалюцыянер, сав. парт., дзярж. і ваен. дзеяч. Скончыў гімназію, у 1904 паступіў у Пецярбургскі політэхн. ін-т, адкуль выключаны ў 1905 за ўдзел у студэнцкіх і рабочых рэв. гуртках. Чл. Іванава-Вазнясенскай с.-д. арг-цыі; адзін з арганізатараў і кіраўнікоў забастоўкі ў г. Іванава-Вазнясенск у 1905, чл. аднаго з першых у Расіі Іванава-Вазнясенскага Савета рабочых дэпутатаў. На чале дружыны іванаўскіх і шуйскіх рабочых дапамагаў рабочым Масквы ў час Снежаньскага ўзбр. паўстання 1905. Дэлегат IV з'езда РСДРП (1906). Не раз арыштаваны, двойчы прыгавораны да пакарання смерцю, замененага пажыццёвай катаргай; 8 гадоў правёў у турмах і на катарзе. У канцы 1914 прыгавораны да пажыццёвай ссылкі ў Сібір, адкуль уцёк. Вёў рэв. работу ў Іркуцку і Чыце. З крас. 1916 на Зах. фронце. Пад псеўд. М.А.Міхайлаў уладкаваўся вольнанаёмным у артыл. часць у мяст. Івянец Мінскай губ., потым статыстыкам к-та Зах. фронту Усерас. земскага саюза ў Мінску. Вёў рэв. агітацыю на фронце, выступаў на мітынгах і падпольных сходах, арганізоўваў братанне салдат. Стварыў у Мінску групу РСДРП, якая стала адным з цэнтраў рэв. работы ў Мінскай губ., мела аддзяленні ў 3-й і 10-й арміях і ваен. майстэрнях. Пасля Лют. рэв. 1917 з 4(17).3 да 12(25).10.1917 нач. нар. міліцыі г. Мінска, адзін са стваральнікаў Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, чл. яго выканкома. Чл. Мінскага к-та РСДРП(б), дэлегат Красавіцкай канферэнцыі РСДРП(б). На 1-м з'ездзе ваен. і рабочых дэп. арміі і тылу Зах. фронту выбраны чл. Франтавога к-та, на 1-м з'ездзе сял. дэпутатаў Мінскай і Віленскай губ. — старшынёй выканкома Савета сял. дэпутатаў Мінскай і Віленскай губ. Старшыня Мінскага губ. сялянскага к-та, кіраўнік дэлегацыі ад Беларусі на 1-м Усерас. з'ездзе сял. дэпутатаў, рэдактар *«Крестьянской газеты»*, адзін з рэдактараў газ. «Звезда» — органа Мінскага к-та РСДРП(б) (гл. *«Звязда»*). У час барацьбы супраць карнілаўшчыны ўзначальваў рэв. войскі Мінскага р-на. 12(25).10.1917 накіраваны ў г. Шуя [старшыня Савета і пав. к-та РСДРП(б)], потым у Іванава-Вазнясенск [старшыня губ. к-та РСДРП(б) і выканкома губ. Савета]. Са студз. 1919 камандуючы 4-й арміяй, з крас. 1919 Паўд. групай войск Усх. фронту, з ліп. 1919 камандуючы Усх., Туркестанскім і Паўд. франтамі. Свой палкаводчы талент выявіў у баях супраць войск Калчака, Урангеля і інш. армій «белай» гвардыі. У 1920—24 упаўнаважаны Рэўваенсавета рэспублікі на Украіне. камандуючы ўзбр. сіламі Украіны і Крыма. З лют. 1922 нам. старшыні Укр. эканам. савета, кіраваў ліквідацыяй бандытызму на Украіне. З сак. 1924 нам. старшыні РВС СССР і наркома па ваен. і марскіх справах СССР, адначасова нач. штаба РСЧА, нач. Ваен. акадэміі РСЧА. Са студз. 1925 старшыня РВС СССР і нарком па ваен. і марскіх справах СССР, з лют. 1925 чл. Савета працы і абароны СССР. На X—XIII з'ездах РКП(б) выбраны чл. ЦК, у 1924 — канд. у чл. Палітбюро ЦК РКП(б). Быў чл. ВЦВК і ЦВК СССР. Вёў ваен.-тэарэт. работу, аўтар прац па ваен. пытаннях. Яго імем у 1926—91 быў названы г. Бішкек. У Мінску на будынку, дзе ў 1917 размяшчалася нар. міліцыя, у г.п. Івянец на доме, дзе жыў Ф., — мемарыяльныя дошкі.



М.В.Фрунзе.

*Тв.:* Избр. произв. М., 1965.

*Літ.:* М.В.Фрунзе: Жизнь и деятельность. М., 1962; Казеко И.И. М.В. Фрунзе в Белоруссии. Мн., 1958; М.В.Фрунзе: Воспоминания друзей и соратников. М., 1965; Лебедев В.А., Ананьев К.В. Фрунзе. М., 1960; Николаев В. Отдаю себя революции... М., 1972; Хаўратовіч І.П. Фрунзе ў Мінску // Маладосць. 1965. №2.

*Іосіф Хаўратовіч.*

**«ФРЫДА»** («Frida»), кодавая назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў супраць партыз. брыгад «Разгром», «За Савецкую Беларусь», імя М.Шчорса і мясц. насельніцтва ў Бярэзінскім р-не Магілёўскай, Барысаўскім, Смалявіцкім і Чэрвеньскім р-нах Мінскай вобл. у ліст. 1942 у Вял. Айч. вайну; састаўная частка агульнага плана гітлераўскага камандавання па ліквідацыі партыз. руху на тэр. генеральнай акр. *«Беларусь»* улетку і ўвосень 1942. Праводзілася сіламі 8-га і 10-га палкоў 1-й матарыз. брыгады СС, асобага батальёна СС Дырлевангера, спец. каманд паліцыі бяспекі і СД, жандармерыі пры падтрымцы танкаў і артылерыі. Карнікі імкнуліся акружыць партызан у раёне азёр Чырвонае, Рыбачнае, Пясочнае і знішчыць іх. Пасля цяжкага бою каля в. Слабада (цяпер Чэрвеньскага р-на) брыгады зрабілі баявы манеўр і выйшлі з акружэння. За час аперацыі карнікі загубілі 136 мясц. жыхароў, захапілі 1280 т збожжа, з разрабаваных вёсак 1600 жыхароў адправілі на прымусовыя работы ў спец. лагер у Смалявічах.

*Валерый Лазебнікаў, Уладзімір Пасэ.*

**ФРЫДМАН** Міра Бенцыянаўна (жн. 1908, мяст. Калінкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер г. Калінкавічы — 28.6.1972), бел. гісторык. Канд. гіст. н. (1947). Скончыла БДУ (1930). Выкладала гісторыю ў віцебскіх пед. рабфаку (1930—35), камуніст. ВНУ (1931—36), пед. ін-це (1936—41). У 1944—72 дацэнт кафедры гісторыі СССР БДУ. Даследавала гісторыю рэв. і сял. руху на Беларусі ў 19 ст., адмену прыгоннага права ў Мінскай губ. Адзін з аўтараў 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 1, 1972).

*Тв.:* Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Реализация реформы 1861 г. в Минской губернии // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1962 г. Мн., 1964.

*Эмануіл Іофе.*

**«ФРЫЦ»** («Fritz»), кодавая назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў супраць партыз. брыгад «Спартак», «За Радзіму», Ф.С.Шляхтунова, імя Варашылава, імя Гастэлы, імя Жукава, імя Ракасоўскага, асобных атрадаў брыгад «Жалязняк», «Народныя мсціўцы», імя С.М.Кароткіна, спец. атрада «Сокал» і мясц. насельніцтва ў Браслаўскім, Відзскім, Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Міёрскім, Пастаўскім, Шаркаўшчынскім р-нах Вілейскай вобл. ў вер.—кастр. 1943 у Вял. Айч. вайну. Праводзілася сіламі ўсх. баявой групы брыгадэнфюрэра СС Гарма (2 паліцэйскія палкі, матарыз. батальён, 2 артыл. дывізіёны, рота сувязі, ням. жандармерыя і паліцыя), паўд. групы обергрупенфюрэра СС Мюлера, зах. групы нач. пагранаховы ген. акругі «Літва» Гахтэля, паўн. групы брыгадэнфюрэра СС Шрэдэра (паліцэйскі полк, авіягрупа, танк. егерская рота). Баявыя групы былі сфарміраваны з ням. паліцэйскіх палкоў і батальёнаў, спец. танк., артыл., авіяц. падраздзяленняў, часцей паграц. аховы ген. акруг «Беларусь», «Латвія», «Літва». 24 вер. карнікі пачалі акружаць тэрыторыю на лініі: воз. Дрысвяты — усх. бераг воз. Аболе — зах. бераг воз. Богінскае — в. Казяны — усх. бераг воз. Вял. Шквакшта — в. Занарач — Чарэмшыцы — Крывічы — Параф'янава — г. Глыбокае — в. Ручай — Наўтароды — Міё-